УДК 070(476)(091)

# ПРЭСА ЯК РЭСУРС НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ БССР У 1920-я гг.

***М. В. ПРАХАРЭНЯ***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Разглядаюцца асаблівасці функцыянавання прэсы як рэсурсу нацыянальнай палітыкі БССР у 1920-я гг. Адзначаецца, што ў гэты перыяд сфарміравалася сістэма друку, якая стала важным звяном у арганізацыі грамадскага, палітычнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця ва ўмовах поліэтнічнасці і шматмоўя. Прыводзяцца даныя аб колькасці перыядычных выданняў, прызначаных для прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей, іх назвы і асаблівасці кантэнту. Падкрэсліваецца, што ў 1920-я гг. прэса, што суправаджала дзяржаўную нацыянальную палітыку, з аднаго боку, прапаноўвала канкрэтныя сацыяльна-эканамічныя і культурныя меры, а з другога боку, спрыяла гуманнай поліэтнічнай камунікацыі, развівала навыкі талерантнага ўзаемадзеяння паміж прадстаўнікамі розных народаў.

***Ключавыя словы:*** прэса БССР; нацыянальная прэса; беларусізацыя; нацыянальная палітыка; нацыянальныя меншасці.

# ПРЕССА КАК РЕСУРС НАЦИОНАЛЬНОЙ ПОЛИТИКИ БССР В 1920-х гг.

***М. В. ПРОХОРЕНЯ***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Рассматриваются особенности функционирования прессы как ресурса национальной политики БССР в 1920-х гг. Отмечается, что в этот период сформировалась система печати, ставшая важным звеном в организации общественно-политической и социально-экономической жизни в условиях полиэтничности и многоязычия. Приводятся данные

**Образец цитирования:**
Прахарэня МВ. Прэса як рэсурс нацыянальнай палітыкі БССР у 1920-я гг. *Журнал Белорусского государственного университета. Журналистика.* 2023;1:50–55.
https://doi.org/10.33581/2788-6638-2023-1-50-55

**For citation:**
Prakharenya MV. Press as a resource of the national policy of the BSSR in the 1920s. *Journal of the Belarusian State University. Journalism.* 2023;1:50–55. Belarusian.
https://doi.org/10.33581/2788-6638-2023-1-50-55

**Автор:**
***Марина Валерьевна Прохореня*** – кандидат филологических наук, доцент; доцент кафедры периодической печати и веб-журналистики факультета журналистики.

**Author:**
***Maryna V. Prakharenya***, PhD (philology), docent; associate professor at the department of periodical press and web journalism, faculty of journalism.
*prakhar@bsu.by*
*https://orcid.org/0000-0002-0718-0564*

о количестве периодических изданий, предназначенных для представителей национальных меньшинств, их названия и особенности контента. Подчеркивается, что в 1920-х гг. пресса, сопровождавшая государственную национальную политику, с одной стороны, предлагала конкретные социально-экономические и культурные меры, а с другой стороны, способствовала гуманному многонациональному общению, развивала навыки толерантного взаимодействия между представителями разных народов.

***Ключевые слова:*** пресса БССР; национальная пресса; белорусизация; национальная политика; национальные меньшинства.

## PRESS AS A RESOURCE OF THE NATIONAL POLICY OF THE BSSR IN THE 1920s

***M. V. PRAKHARENYA***[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

The article identifies the features of the functioning of the press as a resource of the national policy of the BSSR in the 1920s. It is noted that in this period of Belarusian history, the printing system was formed, which became an important link in the organisation of new realities of social, political and economic life in conditions of polyethnicity and multilingualism. Data on the number of periodicals, intended for representatives of national minorities, their names, and content features are given. The conclusion emphasises that the press in the 1920s, accompanying the state national policy, offered concrete actions for the implementation of socio-economic and cultural activities, on the other hand, it promoted humane multi-ethnic communication, developed the skills of tolerant interaction between representatives of different nations.

***Keywords:*** BSSR press; national press; Belarusisation; national policy; national minorities.

### Уводзіны

Сфера міжнацыянальных адносін з'яўляецца адной з важнейшых у працэсе будаўніцтва дэмакратычнага соцыуму і станаўлення грамадзянскай супольнасці ў Беларусі. Сучасная дзяржаўная нацыянальная палітыка грунтуецца на прынцыпах, якія складваліся на працягу стагоддзяў (талерантнае стаўленне да грамадзян, свабоднае развіццё культуры і традыцый прадстаўнікоў этнічных меншасцей).

Асабліва важным перыядам у развіцці гарманічных міжнацыянальных адносін з'яўляюцца 1920-я гг. Паводле даных перапісу 1926 г., у БССР жыло 4 983 240 чалавек, з якіх 80,62 % складалі беларусы, 8,19 % – яўрэі, 7,70 % – рускія, 1,98 % – палякі, 0,69 % – украінцы, 0,28 % – латышы, 0,15 % – немцы, 0,14 % – літоўцы і 0,27 % – прадстаўнікі іншых народаў [1, с. 60]. У гэты час менавіта поліэтнічны склад насельніцтва вызначаў вектар нацыянальнай палітыкі краіны.

Значная роля ў ажыццяўленні практычных мерапрыемстваў нацыянальнай палітыкі належала друкаванай прэсе, у сувязі з чым важна вызначыць асаблівасці яе функцыянавання ў 1920-я гг. Для гэтага неабходна акрэсліць сутнасць дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі БССР у гэты перыяд, прасачыць працэс арганізацыі сістэмы перыядычнага друку ва ўмовах поліэтнічнасці і шматмоўя, а таксама прывесці факталагічныя даныя аб колькасці перыядычных выданняў, прызначаных для прадстаўнікоў этнічных меншасцей, даць іх назвы і прааналізаваць кантэнт.

Метадалогія даследавання заснавана на крытычным асэнсаванні гістарыяграфічных крыніц, праблемнае поле якіх прысвечана пытанням нацыянальнай палітыкі БССР і развіцця друку ў 1920-я гг. Асноўныя напрамкі нацыянальнай палітыкі адлюстраваны ў матэрыялах перыядычнага друку (прааналізаваны выпускі газет «Молат» («Młot»), «Ворыва» («Orka»), «Звязда моладзі» («Gwiazda młodzieży») і «Полесская правда» за 1924–1929 гг.). Факталагічныя даныя аб асаблівасцях функцыянавання перыядычных выданняў і іх колькасці апублікаваны ў справаздачах урада БССР, камісіі па ажыццяўленні нацыянальнай палітыкі пры ЦВК БССР і Інстытута беларускай культуры [1–4]. Пытанням нацыянальнай палітыкі БССР і спецыфіцы грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця прадстаўнікоў этнічных меншасцей прысвечаны навуковыя працы І. А. Пушкіна [5] і М. К. Альховіка [6]. Значны пласт гістарычных крыніц па тэме сканцэнтраваны ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь[1].

Выкарыстоўваліся метады аналізу, сінтэзу, дэдукцыі, а таксама гісторыка-сістэмны (вызначэнне асаблівасцей функцыянавання прэсы ў 1920-я гг.), гісторыка-генетычны (даследаванне нацыянальнай палітыкі ў працэсе яе развіцця) і лагічны метады.

[1]Нац. арх. Рэсп. Беларусь (НАРБ). Ф. 4-п.

## Асноўная частка

У 1920-я гг. адбывалася станаўленне грамадства на сацыялістычнай аснове. Для гісторыі Беларусі гэтага часу характэрны адраджэнне і росквіт нацыянальнай культуры, навукі, адукацыі і мовы. Падчас рэалізацыі палітыкі беларусізацыі ўсебакова развівалася культура (літаратура, музыка, тэатр), ствараліся спецыяльныя ўстановы, у якіх даследаваліся гісторыя і традыцыі народа, а беларуская мова трывала замацоўвалася ва ўсіх сферах жыццядзейнасці грамадства [1]. Нягледзячы на гэта, савецкая ўлада надавала значную ўвагу сферы міжнацыянальных адносін, у тым ліку праблемам забеспячэння прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей, якія пражывалі на тэрыторыі краіны, аднолькавымі правамі. Дзяржаўная палітыка грунтавалася на прынцыпах роўнасці і суверэннасці народаў, гарантавала грамадзянам, якія адносілі сябе да этнічных меншасцей, аднолькавыя палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя і культурныя правы і свабоды [2].

Так, у 1924 г. у адпаведнасці з пастановай «Аб практычных мерапрыемствах па правядзенні нацыянальнай палітыкі» і рэзалюцыяй Пленума ЦК КПБ(б) «Аб праграме работ па правядзенні нацыянальнай палітыкі партыі ў Беларусі» ў якасці дзяржаўных (раўнапраўных) былі абвешчаны не толькі беларуская мова, але і яўрэйская, руская і польская мовы. Афіцыйнае дзяржаўнае чатырохмоўе захоўвалася ў БССР да 1936 г.

Ва ўмовах поліэтнічнасці і шматмоўя ў 1920-я гг. склалася своеасаблівая сістэма перыядычнага друку. Упершыню аб вызначальнай ролі прэсы ў грамадска-палітычным жыцці прадстаўнікоў этнічных меншасцей было заяўлена падчас даклада аб народнай асвеце на Другім Усебеларускім з’ездзе Саветаў у снежні 1920 г. Значная ўвага з боку дзеючай улады надавалася публікацыі газет і часопісаў на мовах прадстаўнікоў нацыянальнасцей, якія пражывалі на тэрыторыі БССР, і павелічэнню іх тыражоў [3]. Так, у 1920 г. выходзіла 21 перыядычнае выданне. З іх 14 выданняў («Звезда», «Белорусская деревня», «Известия ЦИКа Белоруссии», «Голос производственных союзов», «Красная смена», «Бедняк», «Коммунистический труд», «Партийный листок», «Известия уисполкома», «Коммунист», «Путь победы», «Пролетарское слово», «Голос труженика», «Известия Центрального бюро Коммунистической партии (большевиков)») друкаваліся на рускай мове, 3 выданні («Савецкая Беларусь», «Вольны сцяг», «Зоркі») – на беларускай мове, 2 выданні («Будзільнік» («ררועמ ןועש»), «Прафрух» («תיעוצקמ העונת»)) – на яўрэйскай мове, 1 выданне («Вестник Наркомпроса Белоруссии» / «Веснік Наркамасветы Беларусі») публікавалася на рускай і беларускай мовах і 1 выданне («Молат») – на польскай мове [3, с. 69]. На працягу 1920-х гг. колькасць газет і часопісаў на мовах прадстаўнікоў этнічных меншасцей павялічвалася. У іх расказвалася пра мерапрыемствы нацыянальнай палітыкі, асвятляліся пытанні агульнадзяржаўнага будаўніцтва, гісторыі і культуры пэўнага народа.

Так, для яўрэяў як для найбольш шматлікай па колькасці катэгорыі насельніцтва з ліку прадстаўнікоў этнічных меншасцей у 1920-я гг. выходзілі газеты «Будзільнік», «Кастрычнік» («הֶבוֹטְקוֹא»), «Малады ленінец» («ריעצ טסינינל») і часопіс «Малады рабочы» («ריעצ דבוע»). Акрамя таго, у пачатку 1920-х гг. Віцебскі губернскі аддзел па справах нацыянальнасцей сумесна з Яўрэйскім грамадскім камітэтам выдавалі бюлетэнь «Весткі» («תוֹשָׁדָח»). У 1926 г. вакол выдання «Малады рабочы» ўтварылася група з 15 чалавек, якія стварылі літаратурныя гурткі ў Мінску, Віцебску і Полацку, дзе займаліся грамадскай працай сярод рабочых і моладзі: арганізоўвалі вечары ў клубах, друкавалі літаратурныя старонкі і інш. Грамадска-літаратурны напрамак перыёдыкі для яўрэяў прадстаўляў часопіс «Звязда» («בכוכ»). Ён быў створаны ў снежні 1924 г. рашэннем ЦК КП(б) і выдаваўся ў Мінску беларускім аддзяленнем выдавецтва «Школа и книга». У часопісе друкаваліся белетрыстычныя і паэтычныя творы, асвятляліся праблемы эканамічнага, грамадска-палітычага, культурнага і навуковага жыцця [5, с. 98–100].

Інфармацыйныя запатрабаванні рускамоўнага насельніцтва задавальнялі рэспубліканскія («Рабочий», «Звезда» (у 1925 г. выданне пачало друкавацца на змешанай руска-беларускай мове, з 1927 г. яно публікавалася на беларускай мове)) і мясцовыя акруговыя («Заря Запада» (Віцебск), «Полесская правда» (Гомель), «Новая жизнь» (Гомель) і інш.) газеты.

Пастанова аб выданні польскамоўнай газеты «Молат» была зацверджана 1 чэрвеня 1920 г. Газета з’яўлялася друкаваным органам Польскага бюро пры ЦК КП(б)Б і публікавалася штодзённа да 1926 г. Падчас Першага Усебеларускага з’езда сялян-палякаў у 1926 г. было прапанавана выдаваць замест газеты «Молат» газету «Ворыва», якая прызначалася для сялян і выходзіла штотыднёва ў Мінску. Там жа публікавалася газета «Звязда моладзі», асноўнай аўдыторыяй якой была рабоча-сялянская моладзь БССР. Газета была ліквідавана 1 студзеня 1928 г., а яе функцыі былі перададзены газеце «Ворыва», якая стала выходзіць двойчы на тыдзень [3, с. 88].

У гэтых выданнях асвятляліся ўсе сферы жыццядзейнасці прадстаўнікоў этнічных меншасцей БССР. У друкаванай прэсе публікаваліся грамадска-палітычная і сацыяльна-эканамічная інфармацыя, мастацкія творы, матэрыялы аб культурна-асветніцкай рабоце і г. д. Так, у газетах рэгулярна расказвалася пра дзейнасць нацыянальных саветаў – выбарчых органаў грамадзянскага прадстаўніцтва, якія забяспечвалі інфармацыяй членаў этнічных супольнасцей на іх роднай мове («Работа нашага савета»[2] (Молат. 1924. 23 снеж.), «Што сказаў пленум Мінскага акру-

[2]Тут і далей пераклад наш. – *М. П.*

говага камітэта» (Молат. 1925. 15 лют.), «Як прайшлі выбары ў савет» (Молат. 1925. 18 мая), «Не дачакаемся сакратара» (Ворыва. 1926. 12 снеж.), «Рыхтуйцеся да перавыбараў» (Ворыва. 1927. 25 лістап.) і інш.). Арганізацыя нацыянальных саветаў пачалася ў 1924 г. Ужо ў 1929 г. на тэрыторыі БССР налічвалася 67 выбарчых органаў грамадзянскага прадстаўніцтва, з якіх 23 нацыянальныя саветы былі яўрэйскімі, 16 – расійскімі, 19 – польскімі, 5 – латышскімі, 2 – украінскімі і 2 – нямецкімі [3, с. 67].

Практычныя мерапрыемствы нацыянальнай палітыкі, што праводзіліся з 1924 г., былі накіраваны на стварэнне спецыяльных бюро ва ўсіх акругах БССР. Яны існавалі да 1930 г. і зніклі ў сувязі з ліквідацыяй акруг. Пасля гэтага ў раёнах былі ўведзены райупаўнаважаныя органы для работы з прадстаўнікамі пэўных этнічных меншасцей, дзейнасць якіх абмяркоўвалася ў нацыянальных выданнях («Наша бюро» (Молат. 1924. 23 снеж.), «Лічыцца не толькі на паперы» (Ворыва. 1928. 16 ліп.), «Якія кіраўнікі – такое і бюро» (Ворыва. 1928. 2 верас.) і інш.). Для забеспячэння патрэб членаў этнічных супольнасцей у 1920-я гг. былі створаны спецыяльныя ўчасткі народных судоў, асаблівасці функцыянавання якіх адлюстроўваліся на старонках прэсы («Як працуе наш суд» (Молат. 1925. 15 лют.), «Закон для ўсіх аднолькавы» (Молат. 1925. 19 мая), «Народны суд дапаможа» (Ворыва. 1927. 18 снеж.) і інш.).

Адна з вострых праблем, на якой газеты для прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей рэгулярна засяроджвалі ўвагу, тычылася пісьменнасці. Асаблівы акцэнт на неабходнасці вырашэння гэтага пытання рабілі маладзёжныя выданні («Полька, ідзі ў хату-чытальню» (Звязда моладзі. 1924. 13 ліп.), «Змагайцеся з непісьменнасцю» (Звязда моладзі. 1925. 18 студз.), «Усе будзем пісьменнымі» (Звязда моладзі. 1925. 23 кастр.), «Уся моладзь у вячэрняй школе» (Звязда моладзі. 1926. 27 верас.) і інш.). Трэба адзначыць, што ў 1920-я гг. на тэрыторыі БССР вялася падрыхтоўка спецыялістаў з ліку прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей. Так, у Віцебску, Мінску і Гомелі дзейнічалі Яўрэйскі педагагічны тэхнікум імя Э. Фрумкінай, Мінскі польскі педагагічны тэхнікум і Гомельскі яўрэйскі педагагічны тэхнікум. У Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі працавала кафедра, якая рыхтавала спецыялістаў з ліку прадстаўнікоў яўрэйскай моладзі. У Беларускім дзяржаўным універсітэце таксама існавала яўрэйскае аддзяленне. Пры педагагічным факультэце БДУ працавала секцыя, дзе функцыянавала кафедра польскай мовы. Там жа на спецыяльных курсах рыхтавалі работнікаў для культурна-асветніцкай працы сярод прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей [4].

Даволі шмат польскамоўных матэрыялаў аб грамадска-палітычным і культурным жыцці друкавалася ў газеце «Полесская правда» («Обеспечить национальные колхозы литературой» (Полесская правда. 1928. 13 мая), «Улучшить работу среди национальных меньшинств» (Полесская правда. 1928. 18 крас.), «Рабочие поляки БССР строят новую жизнь» (Полесская правда. 1929. 12 лют.) і інш.). Гэта тлумачылася тым, што на тэрыторыі Гомельшчыны жыло шмат палякаў. Акрамя таго, інфармацыя аб жыцці палякаў у БССР размяшчалася ў штомесячным часопісе «Голас слухача» («Głos słuchacza»), які выдавалі студэнты польскага аддзялення Камуністычнага ўніверсітэта нацыянальных меншасцей Захаду імя Ю.-Б. Мархлеўскага ў Маскве [5, с. 100].

Такія выданні, як «Кастрычнік», «Будзільнік», «Малады рабочы», «Ворыва» і «Звязда моладзі», уваходзілі ў спіс сацыяльна значных газет і часопісаў і ў абавязковым парадку паступалі ў нацыянальныя хаты-чытальні, якія працавалі ў многіх раёнах БССР. Так, у 1925–1926 гг. функцыянавалі 9 польскіх і 12 яўрэйскіх хат-чытальняў, а таксама 2 латышскія хаты-чытальні. У 1926–1927 гг. іх колькасць павялічылася да 23 польскіх, 15 яўрэйскіх і 4 латышскіх хат-чытальняў, то бок амаль у 2 разы[3].

Для прадстаўнікоў літоўскага народа ў 1920-я гг. выходзіла газета «Чырвоны араты» («Raudonasis artojas»). Гэта выданне неаднаразова выпісвалі літоўскія рабочыя і сяляне, якія жылі ў ЗША (сярэдняя колькасць экзэмпляраў для замежных чытачоў складала 250–400). У ліпені 1929 г. праз газету пачалася праца па збору сродкаў на пабудову самалёта ў гонар літоўскіх рабочых СССР [3, с. 71].

Пэўная колькасць прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей супрацоўнічалі з выданнямі ў якасці сялянскіх і рабочых карэспандэнтаў. Напрыклад, у сярэдзіне 1920-х гг. газеты «Ворыва» і «Звязда моладзі» мелі каля 200 такіх журналістаў, а газета «Чырвоны араты» – 164 журналіста [4, с. 99]. Праз стварэнне сялянскай і рабочай карэспандэнцкай сеткі актыўныя прадстаўнікі этнічных супольнасцей далучаліся да жыцця савецкай краіны. Іх дзейнасць набыла высокую грамадска-палітычную значнасць, паўплывала на працу структур улады і спрыяла ўдасканаленню механізмаў кіравання.

Пасля з'яўлення раённага друку для сістэматычнага інфармацыйнага абслугоўвання прадстаўнікоў этнічных меншасцей БССР сакратарыят ЦК КП(б)Б прыняў пастанову аб арганізацыі нацыянальных старонак у раённых выданнях. Рэкамендацыі раз у 5 дзён друкаваць паласу на польскай мове былі дадзены газетам «Ударнік Койданаўшчыны» і «Бальшавік Барысаўшчыны», а на яўрэйскай мове – газеце «Полесская правда». Выданне «Віцебскі пралетарый» павінна было выпускаць паласу на яўрэйскай мове кожныя 5 дзён, а на польскай мове – кожныя 10 дзён. У хуткім часе да публікацыі матэрыялаў на польскай

[3]Социальная и культурная роль библиотек Беларуси первой половины XX в. [Электронный ресурс]. URL: https://belaruslibrary.nlb.by/history/rol-bibliotek-belarusi.html (дата обращения: 26.11.2022).

мове павінны былі прыступіць у плешчаніцкай, капыльскай, лепельскай і шклоўскай раённых газетах, на яўрэйскай мове – у дубровенскай, магілёўскай, полацкай і сенненскай раённых газетах. Як правіла, нацыянальныя старонкі ў мясцовых газетах выходзілі кожныя 10 дзён і ўсебакова асвятлялі пытанні арганізацыі жыцця палякаў на тэрыторыі раёна[4]. Дапамагчы ў выданні старонак на мовах прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей было загадана рэдактарам газет «Ворыва» і «Кастрычнік», а таксама супрацоўнікам іншых устаноў. Так, друкарні БССР павінны былі забяспечыць рэдакцыі раённых газет шрыфтамі, аддзел кадраў ЦК КП(б)Б мусіў знайсці спецыяліста для вядзення старонкі ў раённай газеце на нямецкай мове, а Камуністычнаму ўніверсітэту Беларусі імя У. І. Леніна трэба было арганізаваць польскую і яўрэйскую групы на газетным аддзяленні[5].

Акрамя таго, на мовах прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей выпускаліся насценныя газеты. Як правіла, яны выходзілі на прамысловых прадпрыемствах, у хатах-чытальнях, навучальных установах і клубах, асвятлялі жыццё пэўнага рабочага калектыву, апісвалі вытворчы працэс, выступалі выразнікамі грамадскай думкі і развівалі сацыяльную актыўнасць рабочых. У 1920-я гг. можна было прачытаць насценныя газеты на польскай, рускай і яўрэйскай мовах. У маі 1926 г. прайшла Усебеларуская выстава насценных газет на яўрэйскай мове [3].

Паводле афіцыйных даных аддзела друку пры агітацыйна-прапагандысцкім аддзеле ЦБ КП(б)Б, у 1928 г. на тэрыторыі БССР друкаваліся 17 газет, з якіх 9 выданняў выходзілі на беларускай мове, 4 выданні – на рускай мове, 2 выданні – на яўрэйскай мове і 1 выданне публікавалася на польскай мове [4, с. 78]. Паступовае змяншэнне колькасці выданняў на мовах прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей у канцы 1920-х гг. тлумачыцца дэфармацыяй і зменай курса ўнутранай палітыкі, у тым ліку ў сферы міжнацыянальных адносін. Як адзначаў М. К. Альховік, далейшыя этнасацыяльныя працэсы развіваліся ва ўмовах станаўлення савецкай таталітарнай сістэмы, ажыццяўлення рэпрэсій і выкрыцця так званага нацыянал-дэмакратызму, які трактавалі як ідэалогію, што ставіла нацыянальныя інтарэсы вышэй за класавыя [6].

## Заключэнне

На працягу 1920-х гг. у БССР складвалася дзяржаўная мадэль, якая прадугледжвала карэнныя змены ў нацыянальнай палітыцы. Яна была арыентавана на інтэграцыю прадстаўнікоў этнічных меншасцей у агульную савецкую культуру, а таксама іх кансалідацыю з большай часткай насельніцтва – беларусамі.

Найважнейшым рэсурсам ажыццяўлення нацыянальнай палітыкі БССР з'яўлялася друкаваная прэса, якая выходзіла на мовах прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей і асвятляла практычныя мерапрыемствы савецкай улады ў сферы міжнацыянальных адносін (дзейнасць нацыянальных саветаў, судоў, бюро, праца навучальных і культурна-асветніцкіх устаноў і інш.). У 1920-я гг. прэса, што суправаджала дзяржаўную нацыянальную палітыку, з аднаго боку, прапаноўвала канкрэтныя дзеянні па рэалізацыі сацыяльна-эканамічных і культурных мерапрыемстваў, а з другога боку, спрыяла гуманнай поліэтнічнай камунікацыі, развівала навыкі талерантнага ўзаемадзеяння паміж прадстаўнікамі розных народаў. Гэта адбывалася ў сугуччы з тагачаснымі нормамі савецкай маралі, якая прапагандавала такія агульначалавечыя каштоўнасці, як гуманізм, роўнасць і патрыятызм.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Центральная национальная комиссия ЦИК БССР. *Практическое разрешение национального вопроса в Белорусской Социалистической Советской Республике: по материалам Национальной комиссии ЦИК БССР. Часть 1. Белорусизация*. Минск: Центральная национальная комиссия ЦИК БССР; 1927. 146 с.

2. Гаруновіч А, Будзінскі С, рэдактары. *Нацыянальная палітыка камуністычнай партыі*. Мінск: Белдзяржвыд; 1930. 52 с.

3. Центральная национальная комиссия ЦИК БССР. *Практическое разрешение национального вопроса в Белорусской Социалистической Советской Республике: по материалам Национальной комиссии ЦИК БССР. Часть 2. Работа среди национальных меньшинств в БССР*. Минск: Центральная национальная комиссия ЦИК БССР; 1928. 159 с.

4. Нацыянальная камісія ЦВК БССР. *Два гады нацыянальнай работы ў БССР: збор прамоў, артыкулаў і рэзалюцый па нацыянальным пытанні*. Мінск: Нацыянальная камісія ЦВК БССР; 1929. 167 с.

5. Пушкін ІА. *Нацыянальныя меншасці БССР у грамадска-палітычным і культурным жыцці (20-я гады XX ст.)*. Магілёў: Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова; 2004. 167 с.

6. Альховік МК. Да пытання аб нацыянальнай палітыцы партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва ў Беларускай ССР у 1930-я гг. *Веснік Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя грамадскіх і гуманітарных навук*. 2011;1:3–7.

[4]НАРБ. Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 5451. Арк. 63.

[5]Там жа. Арк. 64.

## References

1. Central National Commission of the CEC of the BSSR. *Prakticheskoe razreshenie natsional'nogo voprosa v Belorusskoi Sotsialisticheskoi Sovetskoi Respublike: po materialam Natsional'noi komissii TsIK BSSR. Chast' 1. Belorusizatsiya* [Practical resolution of the national question in the Belarusian Socialist Soviet Republic: based on the materials of the National Commission of the CEC of the BSSR. Part 1. Belarusisation]. Minsk: Central National Commission of the CEC of the BSSR; 1927. 146 p. Russian.

2. Garunovich A, Budzinski S, editors. *Nacyjanal'naja palityka kamunistychnaj partyi* [National policy of the communist party]. Minsk: Beldzjarzhvyd; 1930. 52 p. Belarusian.

3. Central National Commission of the CEC of the BSSR. *Prakticheskoe razreshenie natsional'nogo voprosa v Belorusskoi Sotsialisticheskoi Sovetskoi Respublike: po materialam Natsional'noi komissii TsIK BSSR. Chast' 2. Rabota sredi natsional'nykh men'shinstv v BSSR* [Practical resolution of the national question in the Belarusian Socialist Soviet Republic: based on the materials of the National Commission of the CEC of the BSSR. Part 2. Work among national minorities in the BSSR]. Minsk: Central National Commission of the CEC of the BSSR; 1928. 159 p. Russian.

4. National Commission of the CEC of the BSSR. *Dva gady nacyjanal'naj raboty w BSSR: zbor pramow, artykulaw i rjezaljucyj pa nacyjanal'nym pytanni* [Two years of national work in the BSSR: collection of speeches, articles and resolutions on national questions]. Minsk: National Commission of the CEC of the BSSR; 1929. 167 p. Belarusian.

5. Pushkin IA. *Nacyjanal'nyja menshasci BSSR u gramadska-palitychnym i kul'turnym zhycci (20-ja gady XX st.)* [National minorities of the BSSR in social, political and cultural life (20s of $20^{th}$ century)]. Mahilioŭ: Mogilev State A. Kuleshov University; 2004. 167 p. Belarusian.

6. Al'hovik MK. [To the question of the national policy of the party-state leadership in the Belarusian SSR in the 1930s]. *Bulletin of Polessky State University. Series in Social Sciences and Humanities*. 2011;1:3–7. Belarusian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 27.11.2022.*
*Received by editorial board 27.11.2022.*